# ЯКУБ КОЛАС
## 22 ОКТЯБРЯ 1882 — 13 АВГУСТА 1956



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Нарадзіўся Якуб Колас 3 лістапада (22 кастрычніка па старым стылі) 1882 года ў вёсцы Акінчыцы на Стаўбцоўшчыне ў сям'і лесніка. Сапраўднае імя - Канстанцін Міцкевіч. Раннія дзіцячыя гады прайшлі ў лесніковых сядзібах Ласток і Альбуць, што недалёка ад вёскі Мікалаеўшчына. У 1898 паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую паспяхова скончыў у 1902 годзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Ужо ў 10-гадовым узросце, пад уплывам твораў Крылова, склаў байку «Варона і Лісіца», а праз тры гады напісаў першы верш «Вясна». Бацька заахвочваў літаратурныя схільнасці хлопчыка, тым жа часам Костусь пазнаёміўся з беларускай літаратурнай творчасцю, вершам Я. Лучыны «Стары ляснік», і быў ад яе пад пэўным уражаннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У семінарысцкія гады яшчэ болей захапіўся літаратурай, пазнаёміўся з творамі А. Пушкіна, М. Лермантава, М. Гогаля, А. Кальцова, М. Някрасава, Л. Талстога, І. Хемніцара, Т. Шаўчэнкі, І. Франко, А. Міцкевіча. Складаў вершы і байкі па-руску. Займаўся зборам беларускага этнаграфічнага і фальклорнага матэрыялу. Значны ўплыў на Костуся выкладчык семінарыі Ф. Кудрынскі, які заахвочваў літаратурныя заняцці і звярнуў увагу маладога паэта на вартасць пісання па-беларуску. Міцкевіч пачаў пісаць вершы і прозу на беларускай мове. Вершы гэтыя прысвячаліся прыродзе, нялёгкай долі селяніна. У тыя ж гады напісаны паэмы «Каля кастра» і «Страх», тэксты якіх не захаваліся, а таксама першая проза па-беларуску — нарыс «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У друку дэбютаваў вершам, напісаным па-беларуску «Наш родны край». У 1910 у Вільні выйшаў першы зборнік вершаў «Песьні-жальбы», затым — кнігі прозы «Апавяданні», «Родныя з'явы». У Пецярбургу ў 1913 асобнымі выданнямі выйшлі апавяданні «Тоўстае палена» і «Нёманаў дар», апавяданні вершам «Прапаў чалавек. Паслушная жонка. Грушы сапяжанкі» і «Батрак. Як Юрка збагацеў». У савецкі час выдадзены кніга апавяданняў «Казкі жыцця», зборнік вершаў «Водгулле», паэма «Новая зямля», якая ёсць своеасаблівай паэмай вясковага жыцця, аповесць «У палескай глушы», зборнікі апавяданняў «Крок за крокам», «На рубяжы», «Першыя крокі», «У ціхай вадзе», паэма «Сымон-музыка», аповесць «На прасторах жыцця», аповесці «У глыбі Палесся»,«Адшчапенец», «Дрыгва», зборнікі вершаў «Нашы дні», «Адпомсцім», «Голас зямлі», паэмы «Суд у лесе», «Адплата», зборнік вершаў «Мой дом», паэма «Рыбакова хата», трылогія «На ростанях», зборнік вершаў «Жыве між нас геній» і інш. Няскончанай засталася паэма «На шляхах волі», распачатая ў 1926 г. Многія вершы Я. Коласа пакладзены на музыку.

Аўтар твораў для дзяцей — паэмы «Міхасёвы прыгоды», вершаванай казкі «Рак-вусач», зборнікаў вершаў «На рэчцы зімой», «Вершы для дзяцей», зборнікаў апавяданняў «У старых дубах», «Раніца жыцця». Апрацаваў шэраг беларускіх народных казак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Настаўнічаў у вёсках Люсіна Ганцавіцкага раёну, Пінкавічы Пінскага раёну. За рэвалюцыйную прапаганду ў 1906 годзе быў пераведзены з Пінкавічаў у Верхменскую народную вучэльню Ігуменскага павету. За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе 10 ліпеня 1906 года быў звольнены. Зімой 1906—1907 гг. жыў ва ўрочышчы Смольня, вёў прыватную школу. У траўні-чэрвені 1907 г. працаваў у газеце «Наша ніва» ў Вільні, быў загадчыкам літаратурнага аддзелу, але на загад паліцыі мусіў пакінуць Вільню. У 1908 годзе — праца ў прыватнай школе ў вёсцы Сані Талачынскага раёну. 15 верасня 1908 г. за ўдзел у настаўніцкім з'ездзе і нелегальную работу быў асуджаны на тры гады, адбываў пакаранне ў мінскім астрозе. У 1912—1914 гг. працаваў настаўнікам у 3-й прыходзкай навучальні ў Пінску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



У час першае сусветнай вайны разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Дзмітраўскі павет Маскоўскаё губерні, настаўнічаў у сяле Старыкава. Быў мабілізаваны ў армію (верасень 1915). Скончыў Аляксандраўскую ваенную навучальню (Масква, 1916). Служыў у запасным палку ў Пярмі. Летам 1917 у чыне падпаручніка накіраваны на Румынскі фронт, але цяжка захварэў і быў эвакуяваны ў горад Абаянь на Куршчыне, дзе жыла ягоная жонка з дзецьмі. Працаваў там настаўнікам, школьным інструктарам. Паводле дэкрэту Савецкага ўраду ў пачатку 1918 звольнены з войска як настаўнік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На выклік ураду БССР у траўні 1921 пераехаў у Менск. Па прыездзе працаваў у Навукова-тэрміналагічнай камісіі Народнага камісарыяту асветы, выкладаў у Мінскім беларускім пэдагагічным тэхнікуме, у Беларускім дзяржаўным універсітэце, чытаў лекцыі на курсах настаўнікаў, займаўся навуковай дзейнасцю ў Інстытуце беларускай культуры. З дня ўтварэння Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі быў яе нязменным віцэ-прэзідэнтам. У 1935 г. удзельнічаў у рабоце Кангрэсу ў абарону культуры ў Парыжы. У Вялікую Айчынную вайну жыў у Клязьме,Ташкенце, Маскве, займаўся творчай і навукова-грамадзкай дзейнасцю. У снежні 1944 г. вярнуўся ў Мінск. Быў сябрам ЦВК БССР, дэпутатам Вярхоўнага Савету СССР і БССР, з'яўляўся старшынёй Беларускага рэспубліканскага камітэту абароны міру. Акадэмік АН БССР. Сябра Саюзу пісьменьнікаў СССР з 1934г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кавалер Ордэна Леніна, Ордэна Чырвонага Сцяга, Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946, за вершы ваеннага часу; 1949, за паэму «Рыбакова хата»).

У 1959—1965 гг. прысуджалася літаратурная прэмія імя Я. Коласа. З 1965 г. прысуджалася Дзяржаўная прэмія імя Якуба Коласа за лепшыя празаічныя і літаратуразнаўчыя працы. Яго імя нададзена Мінскаму паліграфічнаму камбінату, Інстытуту мовазнаўства НАН РБ, Віцебскаму драматычнаму тэатру, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН РБ і іншым бібліятэкам. Імем Я. Коласа быў названы Нацыянальны дзяржаўны гуманітарны ліцэй з філіялам і Нясвіжскі дзяржаўны каледж. Імя Я. Коласа носяць школы, плошчы, вуліцы гарадоў і вёсак Беларусі.
Помнікі паэту пастаўлены ў Мінску (на плошчы, названай у яго гонар), у вёсцы Мікалаеўшчына, Навагрудку, у вёсцы Плоскае[3]Талачынскага раёна. Бюст паэту ўсталяваны ў Нясвіжы. У Мінску працуе Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, яго філіялы знаходзяцца ў Стаўбцоўскім раёне: у Акінчыцах, Смольні, Мікалаеўшчыне і Альбуці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ